**ЧЫГРЫН Сяргей Мікалаевіч**
**(24.09.1958г.)**



Паэт, літаратуразнавец, гісторык, краязнавец, перакладчык, журналіст. Нарадзіўся ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Скончыў тэатральнае аддзяленне факультэт Белдзяржуніверсітэта. Працаваў загадчыкам аддзела культуры і спадчыны “Газеты Слонімскай”, загадчыкам літаратурнай часткі Слонімскага беларускага драматычнага тэатра. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Дэбютаваў вершам “Свеціць сонейка” у часопісе “Бярозка” (1975г.). Аўтар зборнікаў паэзіі “Шчырая Шчара” (1993г.), “Горад без цябе” (1999г.), “Лірыка” (2007г.), “Камень Міндоўга” (2009г.), кнігаў гісторыка-краязнаўчых артыкулаў “Янка Купала і Слонімшчына” (1993 г.), “Родам са Слонімшчыны” (2003г.), “Пакліканыя на родны парог”(2005г.), “Чамяры і чамяроўцы” (2006г.), “У пошуках слонімскіх скарбаў” (2007 г.), “Беларуская Беласточчына” (2008 г.), “Тэатар у Слоніме”(2008г.), “З беластоцкай зямлі” (2008 г.), “Мастак Антон Карніцкі” (2009 г.), “Жыў роднай песьняй” (2010г.), “Па слядах Купалы і Коласа” (2012г.), “Такі іх лёс” (2012г.) і шмат іншых.

Апублікаваў сотні артыкулаў з даследаваннямі жыццёвага і творчага шляху Язэпа Стаброўскага, Тодара Лебяды, Сяргея Хмары, Яна Пятроўскага, Гальяша Леўчыка, Міколы Шкялёнка і іншых дзеячоў беларускай літаратуры, гісторыі і культуры. А таксама шэраг артыкулаў, звязаных з гісторыяй Слонімшчыны, беларускай эміграцыяй, літаратурнай Беласточчынай.

Уклаў і выдаў літаратурную спадчыну С. Грынкевіча, Ф. Грышкевіча, У. Казлоўшчыка (Беласток, “Вяртанне да сваіх”(1999 г.), гістарычныя нарысы Міколы Шкялёнка (Беласток, “Беларусь і суседзі” (2003г.), Сяргея Хмары “Рабінавы хмель” (2008 г.), Леаніда Трубача “Паміж песняй і болем” і іншыя.

На беларускую мову пераклаў вершы французскіх паэтаў - Поля Элюара, Луізы Мішэль, Эжэна Пацье, Поля Вэрлена і ўкраінскіх паэтаў - Рыгора Елішэвіча, Валерыя Бойчанкі, Любові Пшанічнай і іншых. Пераклаў таксама п’есы А. Хайта, К. Манье, Э. Успенскага, К. Гальдоні, А. Астроўскага, С. Міхалкова, С. Пракоф’евай, Н. Абрамцавай, Г. Лабакіна, К. Папова, М. Каляды і іншых драматургаў. Многія спектаклі па п’есах гэтых драматургаў пастаўленыя на сцэне Слонімскага беларускага драмтэатру і іншых тэатраў Беларусі. Напісаў п’есу для дзяцей “Белая мышка” (пастаўленая ў 2005г.). Аўтар шматлікіх паштовак, буклетаў, плакатаў, прысвечаных гісторыі Беларусі.

Жыве ў Слоніме.

## Бібліяграфія


1. **Зэльвенскі зарапад** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 12—17.
2. **Нельга выкінуць, як слова з песні** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 59—61.
3. **Чигрин Сергей Николаевич** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://nashi-lyudi.by/person/chigrin-sergej-nikolaevich/. - Дата обращения: 30.11.2022.
4. **Чыгрын Сяргей Мікалаевіч** // Памяць. Зэльвенскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск: Паліграфафармленне, 2003. — С. 426—427.
5. **Чыгрын Сяргей Мікалаевіч** // Пяткевіч, А. Людзі культуры Гродзеншчыны: даведнік [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://pdf.kamunikat.org/16329-1.pdf . - Дата звароту: 30.11.2022.
6. **Чыгрын, С. Краязнаўчымі сцежкамі Зэльвеншчыны**: артыкулы, гутаркі / Сяргей Чыгрын. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — 148 с.
7. **Чыгрын Сяргей** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://kamunikat.org/Czyhryn_Siarhiej.html . - Дата обращения: 30.11.2022.
8. **“Я пачынаюся з Купалы”** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 56—59.